ЧЫРВОНААРМЕЙСКАЯ, 9

Новы этап — новыя магчымасці

Беларуская дэлегацыя наведала інаўгурацыю турэцкага Прэзідэнта

У пачатку тыдня адбылася цырымонія інаўгурацыі Прэзідэнта Турэцкай Рэспублікі Рэджэпа Таіпа Эрдагана. Кіраўніком айчыннай дэлегацыі на мерапрыемстве быў старшыня Савета Рэспублікі Нацыянальнага сходу Міхаіл МЯСНІКОВІЧ.

Праграма знаходжання спікера верхняй палаты атрымалася насычанай: акрамя двухбаковых сустрэч з членамі ўрада Турцыі і кіраўнікамі замежных дэлегацый, была запланавана сустрэча з Ісмаілам Кахраманам — выконваючым абавязкі спікера парламента Турцыі да абрання новага спікера 13 ліпеня 2018 года.

У цырымоніі інаўгурацыі традыцыйна прынялі ўдзел многія замежныя дэлегацыі, у тым ліку — з краін СНД, Еўропы, Цэнтральнай Азіі і Блізкага Усходу. Дзясяткі прэзідэнтаў, спікераў парламентаў, прэм'ер-міністраў і іншых высокіх службовых асоб прысутнічалі на мерапрыемстве.

Нагадаем, 9 ліпеня ў 18 гадзін Рэджэп Таіп Эрдаган прынёс прысягу і зрабіў сваю першую заяву, а таксама аб'явіў склад свайго кабінета. Дарэчы, згодна з унесенымі папраўкамі ў канстытуцыю краіны пасада прэм'ер-міністра была скасаваная, форма праўлення стала прэзідэнцкай, таму Рэджэп Таіп Эрдаган атрымаў вельмі высокія паўнамоцтвы.

На варце здароўя

Фармацэўтычны завод у Скідзелі запусцяць у кастрычніку бягучага года

Аб гэтым дамовіліся на сустрэчы старшыня Савета Рэспублікі Нацыянальнага сходу, куратар беларуска-індыйскага супрацоўніцтва Міхаіл Мясніковіч і індыйскія інвестары, якія рэалізуюць праект па будаўніцтве фармацэўтычнага прадпрыемства «Навалок».

Што дасць гэты завод нашай краіне? Істотна ўзрасце вытворчасць айчынных запатрабаваных лекаў для патрэб унутранага рынку Беларусі і на экспарт.

Падчас сустрэчы бакі абмеркавалі і далейшае развіццё праекта: плануецца арганізацыя сінтэзу субстанцый для вытворчасці лекаў ад дыябету, кардыязахворванняў і СНІДу.

Гэта не першы беларуска-індыйскі праект у галіне фармацэўтыкі: фактычна завершана будаўніцтва фармзаводаў у Бешанковічах, таксама вядуцца работы па будаўніцтве завода ў Калядзічах.

Міхаіл Мясніковіч станоўча ацаніў працу індыйскіх партнёраў, звярнуў увагу на пытанні якасці прадукцыі, падрыхтоўкі кваліфікаваных работнікаў і афармлення дакументацыі.

Ад нацыянальнага да міжнароднага

У Савеце Рэспублікі абмеркавалі далейшую дзейнасць па дасягненні Мэт устойлівага развіцця.

Гэта тэма стала ключавой на сустрэчы намесніка старшыні Савета Рэспублікі, нацыянальнага каардынатара па дасягненні Мэт устойлівага развіцця Мар'яны ШЧОТКІНАЙ, членаў Савета па ўстойлівым развіцці з пастаянным каардынатарам ААН у Беларусі Іаанай Казана-Вішнявецкі і кіраўнікамі арганізацый сістэмы ААН у нашай краіне.

На думку Мар'яны Шчоткінай, пасля стадыі станаўлення нацыянальнай архітэктуры дасягнення Мэт устойлівага развіцця варта звярнуць увагу на больш маштабны праект, які можна распрацаваць і рэалізаваць разам з міжнароднай супольнасцю. Ён будзе накіраваны на функцыянальныя арыенціры ў рабоце па дасягненні МУР, упэўнена віцэ-спікер верхняй палаты.

Нагадаем, зараз асноўная задача ўсіх зацікаўленых бакоў — удзел у фарміраванні канцэпцыі Нацыянальнай стратэгіі ўстойлівага развіцця на перыяд да 2035 года. Яна распрацоўваецца ўрадам. Акрамя таго, нельга забываць аб стварэнні адзінай сістэмы каардынацыі дзейных праграм.

Уладзіслаў ЛУКАШЭВІЧ.

ЗНЕШНЯЯ ПАЛІТЫКА

Падтрымаць статус міратворчай платформы і знайсці партнёраў

У Мінску пачаўся штогадовы семінар для кіраўнікоў консульстваў і дыппрадстаўніцтваў, падчас якога яны абмяркоўваюць шырокі спектр пытанняў міжнароднага супрацоўніцтва.

ВА ЎМОВАХ СУПЯРЭЧНАСЦЯЎ

«На працягу пяці дзён мы пагаворым аб многіх ключавых пытаннях нашай сумеснай працы. Прааналізуем, як выконваюцца эканамічныя і палітычныя задачы, якія год таму перад намі паставіў Прэзідэнт на нарадзе па прыярытэтах знешняй палітыкі краіны», — звярнуўся да сваіх падначаленых **міністр замежных спраў Уладзімір МАКЕЙ**.

Асаблівая ўвага, паводле яго слоў, будзе ўдзелена тэматыцы прасоўвання турыстычных паслуг і падрыхтоўкі да правядзення ў нашай краіне ў 2019 годзе Еўрапейскіх гульняў.

Кіраўнік МЗС адзначыў, што свае задачы дыпламаты рэалізуюць у няпростых абставінах, калі супярэчнасцяў паміж дзяржавамі не становіцца менш. На высокім узроўні захоўваюцца канфлікты, санкцыі, контрсанкцыі, у тым ліку і ў адносінах паміж некаторымі асноўнымі партнёрамі Беларусі.

Пры гэтым ён адзначыў, што тая знешняя палітыка, якая праводзіцца краінай у цяперашняй сітуацыі па падтрыманні паважлівага і раўнапраўнага дыялогу, пацвярджае свае актуальнасць і запатрабаванасць на практыцы. За краінай ужо замацаваўся статус міратворчай пляцоўкі па ўрэгуляванні рэгіянальных канфліктаў, дзякуючы якой аднаўляецца ўзаемны давер і зніжаецца напружанасць у Еўропе.

«Статус досыць адказны, дазваляе па-новаму зірнуць на Беларусь шматлікім палітычным і эканамічным партнёрам. Разам з тым гэты статус мае патрэбу ў паўсядзённай настойлівай і карпатлівай працы па яго пацвярджэнні», — падкрэсліў Уладзімір Макей.

Таксама ён нагадаў, што пытанні эканомікі былі і застаюцца асноўным крытэрыем ацэнкі дзейнасці кіраўнікоў дыпламатычных прадстаўніцтваў і консульстваў.

Фота БелТА.

СУМЕСНА З ПАРЛАМЕНТАМ

Важнай часткай семінара стала сустрэча беларускіх дыпламатаў з кіраўнікамі двухбаковых міжпарламенцкіх груп супрацоўніцтва ў Савеце Рэспублікі.

Намеснік старшыні Савета Рэспублікі Мар'яна ШЧОТКІНА адзначыла, што апошнім часам супрацоўніцтва паміж парламентарыямі розных краін актывізавалася, адбываецца шмат візітаў, насычаных эканамічнай тэматыкай.

— Нам патрэбны веды і інфармацыя, якімі валодаеце вы, незалежна ад накіраванасці двухбаковых адносін, — звярнулася да дыпламатаў віцэ-спікер. — І перш за ўсё гэта — заканадаўства. У кожнай дзяржаве ёсць пэўныя поспехі, якія можна экстрапаліраваць на нашу краіну.

Пра тое, што ўзаемадзеянне паміж кіраўнікамі дыпламатычных місій і кіраўнікамі краінавых груп у парламенце ўзаемна карыснае і Савету Рэспублікі, і Міністэрству замежных спраў, казаў на сустрэчы **намеснік міністра замежных спраў Андрэй ДАПКЮНАС**. Узаемадзеянне гэта не абмяжоўваецца ўласна праблематыкай парламенцкай дзейнасці, дадаў дыпламат. «У асобе кіраўнікоў краінавых груп мы маем не проста парламентарыяў, мы маем вопытных дзяржаўных дзеячаў, якія валодаюць сур'ёзным бачаннем і агульнага дзяржаўнага парадку, і ў тым ліку магчымасцяў канкрэтнага краінавага кірунку», — растлумачыў ён. Андрэй Дапкюнас заклікаў сенатараў да ініцыятывы і запэўніў, што міністэрства будзе самым зацікаўленым памочнікам у далейшым наладжванні парламенцкага ўзаемадзеяння.

НАД ПАЛІТЫКАЙ

Яшчэ адзін аспект, які быў закрануты на сустрэчы ў Савеце Рэспублікі, — дасягненне Мэт устойлівага развіцця да 2030 года. Віцэ-спікер, якая з'яўляецца нацыянальным каардынатарам па гэтай тэме, паведаміла кіраўнікам дыпламатычных місій, што ў найбліжэйшы час плануецца яе справаздача кіраўніку дзяржавы.

Фота БелТА.

— Мы вельмі цесна тут працуем з Міністэрствам замежных спраў, — звярнула ўвагу сенатар. — Гэта была ініцыятыва міністэрства, задачы якога прыгожа ўпісваюцца ў Мэты ўстойлівага развіцця.

Мар'яна Шчоткіна праінфармавала беларускіх паслоў аб тым, што ўжо зроблена Беларуссю на шляху дасягнення 17 Мэт устойлівага развіцця і звярнула ўвагу дыпламатаў на тое, што зараз Беларусь лідзіруе ў працэсе дасягнення Мэт устойлівага развіцця і гэту пазіцыю нельга страціць. Наша краіна адна з першых прадставіла добраахвотны нацыянальны даклад на Палітычным форуме высокага ўзроўню па ўстойлівым развіцці пад эгідай Эканамічнага і сацыяльнага Савета ААН. Мы правялі першы рэгіянальны форум нацыянальных каардынатараў.

«Самы галоўны прынцып — нікога не пакідаць убаку, — падкрэсліла нацыянальны каардынатар. — Гэтым прынцыпам сёння кіруюцца палітыка і эканоміка ў любой краіне. Мэты кладуцца ў аснову стратэгій устойлівага развіцця краін». Мар'яна Шчоткіна папрасіла супрацоўнікаў МЗС не заставацца ўбаку і садзейнічаць руху да ўстойлівага развіцця.

Ілья КРЫЖЭВІЧ,
Вольга МЯДЗВЕДЗЕВА.